**УДК 379.85+94(476) «1935»**

**Булаты П.Ю.,** канд. гіст. навук
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры
Рэспубліка Беларусь, Мінск
**Bulaty P.,** Cand. of Historic. Sciences
Belarusian State University of Physical Culture
The Republic of Belarus, Minsk

# РЭГУЛЯВАННЕ ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ВОЗЕРЫ СВІЦЯЗЬ У МІЖВАЕННЫ ЧАС

**Анатацыя.** У артыкуле прыводзяцца ўведзеныя ў 1935 годзе правілы наведвання возера Свіцязь, якое з'яўлялася важным аб'ектам рэкрэацыі. Правілы былі апублікаваныя ў турыстычна-інфармацыйны бюлетэні «W nowogródzkiej stronie». Даследаванне правілаў дазволіць выявіць важныя вехі гісторыі развіцця і рэгулявання турыстычнай дзейнасці на беларускіх землях.

**Ключавыя словы:** турызм; гісторыя турызму; Наваградскі павет; возера Свіцязь.

# REGULATION OF TOURIST ACTIVITIES ON LAKE SVICIAŹ IN THE INTERWAR TIME

**Abstract.** The article examines the rules introduced in 1935 for visiting Lake Sviciaź, which was an important object of recreation. The rules were publish in the tourist newsletter "W nowogródzkiej stronie". The study of the rules will reveal important milestones in the history of development and regulation of tourism in the Belarusian lands.

**Keywords:** tourism; history of tourism; Navahradak district; Lake Sviciaź.

У міжваенны час на землях Заходняй Беларусі актыўна развіваліся разнастайныя формы і віды ўнутранага турызму. Пры ажыццяўленні турыстычнай дзейнасці дзяржаўнымі органамі ўлады і грамадскімі турыстычнымі арганізацыямі выкарыстоўваліся шматлікія і разнастайныя рэсурсы ўключна з багатымі рэсурсамі, якія змяшчаліся на землях сучаснай Беларусі. Органы дзяржаўнай улады ўсведамлялі і бачылі ў развіцці турыстычнай і рэкрэацыйнай галіны значныя магчымасці для сацыяльна-эканамічнага развіцця ўсходніх рэгіёнаў. Укараненне і падтрымка турыстычнай ініцыятывы вызначыла рост попыту на мясцовы турыстычны прадукт і пад'ём турыстычна-рэкрэацыйнай актыўнасці на землях Віленскага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў. Акрамя таго, турыстычная дзейнасць, як частка сацыяльнай сферы, рэгулявалася рознымі заканадаўчымі інструментамі.

Важным турыстычным аб'ектам міжваеннага часу было возера Свіцязь (возера ў Наваградскім раёне, каля мяжы з Карэліцкім раёнам). Абумоўлена гэта двума фактарамі:

1) возера мела рэкрэацыйны патэнцыял (чыстая вада, сасновы лес, пясчаны пляж);

2) возера было звязана з жыццём і творчасцю паэта Адама Міцкевіча, культ якога актыўна прадуцыраваўся ў міжваенны час (постаць А. Міцкевіча была своеасаблівым турыстычным брэндам Навагрудчыны).

Для павятовых уладаў Навагрудскага павету возера Свіцязь мела вялікае значэнне не толькі як культурная спадчына, але і як істотны рэкрэацыйны рэсурс, які трэба было ахоўваць. Адпаведна, рабіліся захады па рэгуляванню турыстычнай дзейнасці на Свіцязі, каб рэсурс як мага больш часу быў у годным стане і даўжэй выкарыстоўваўся ў турыстычнай дзейнасці.

У 1935 г. Галоўнае ўпраўленне дзяржаўных лясоў у Варшаве выдала адмысловую пастанову, якой рэгулявалася турыстычная дзейнасць на возеры Свіцязь (на той час Свіцязь ужо мела статус заказніка). Гэтыя правілы былі апублікаваны на старонках выдання «W nowogródzkiej stronie» («У Навагрудскім краі»), у 7 нумары за жнівень 1935 г.

Выданне «W Nowogródzkiej Stronie» адносілася да тыпу турыстычна-інфармацыйных бюлетэняў. Выходзіла яно пры падтрымцы грамадскай арганізацыі «Związek Propagandy Turystycznej Ziemi Nowogródzkiej» (Саюз турыстычнай прапаганды Навагрудскага рэгіёна). Выданне «W Nowogródzkiej Stronie» з'яўлялася перыядычным і выходзіла адзін раз на месяц. На старонках выдання змяшчаліся матэрыялы featureразнага кшталту, датычныя турыстычнай тэматыкі: афіцыйныя звесткі, інфармацыйныя нататкі, рэклама, большую частку займалі навукова-папулярныя артыкулы, прысвечаныя прывабным турыстычным аб'ектам рэгіёна.

Прыведзеныя правілы маюць цікавасць па наступных прычынах:

1) гэта ўзор права ў турыстычнай сферы. У прыведзеных правілах можна прасачыць адносіны да турыстычнага рэсурсу, захады па яго ахове, бачанне сітуацыі і спробы ўплыву на яе, характэрнае для сваёй эпохі;

2) праз правілы можна прасачыць стан развіцця турыстычнай індустрыі, яе віды і формы арганізацыі, асаблівасці выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў.

Такім чынам, прыводзім апублікаваныя правілы ў нашым перакладзе [1]:

### П Р А В І Л Ы
### для наведвальнікаў заказніка Свіцязь
### ў раёне аднайменнай дзяржаўнай лясной інспекцыі

1. Уваход у заказнік, пазначаны на тэрыторыі як частковы заказнік (былы маёнтак Пяшчанка і яго наваколле), бясплатны, а па-за яго межамі – толькі платна. Уваходны білет для дарослых – 25 грошаў, для дзяцей і падлеткаў – 10 грошаў, а таксама талоны перыядычнага ўезду, якія дзейнічаюць на ўвесь турыстычны сезон, па цане 3 злотых, выдае дзяржаўная лясная інспекцыя «Свіцязь» у Батораўцы і лясніцтва Свіцязь на месцы.

2. Уезд у запаведнік у цэлым дазваляецца пешаходам, доступ на конях, запрэжках, аўтамабілях і веласіпедах – толькі ў адзначаных месцах, а прыпынак – толькі ў прызначаных для іх месцах. Каб увайсці ў возера на лодцы або каноэ,

патрабуецца асобны дазвол. У запаведнік забаронены ўваход з паляўнічай зброяй і сабакамі.

3. У заказніку дазваляецца знаходзіцца і хадзіць толькі па дарогах і сцежках, а таксама ўздоўж часткі ўзбярэжжа, прызначанай для прыняцця сонечных ваннаў. Забараняецца падымацца на стромкія берагі возера, хадзіць па агароджаных месцах, парослых маладымі лясамі і лугамі. Забаронена дабірацца да берагоў на лодках і каноэ ў кропках, не пазначаных як прыстані.

4. Адпачынак і бівак дазваляецца толькі ў месцах, прызначаных для гэтага дзяржаўнай лясной інспекцыяй «Свіцязь».

5. Забараняецца разводзіць вогнішчы па-за месцамі, прызначанымі для біваку, пакідаць вогнішчы незатушанымі і ў стане тлення. У перыяд з 1 красавіка па 1 кастрычніка забаронена курэнне па-за месцамі, прызначанымі для біваку.

6. Забараняецца засмечваць заказнік, забруджваць ваду возера, размяшчаць надпісы і знакі на дрэвах і любых іншых аб’ектах заказніка. Купацца і прымаць сонечныя ванны дазволена толькі ў адведзеных для гэтага месцах.

7. У заказніку забараняецца паводзіць сябе шумна, у прыватнасці, арганізоўваюць аркестравыя і танцавальныя гульні, латарэі і спартыўныя гульні; стральба таксама забароненая.

8. Забараняецца збіраць кветкі і іншыя часткі раслін, выкопваць расліны, вымаць іх з вады, ламаць галінкі, збіраць ягады, грыбы і іншую лясную прадукцыю. Забараняецца лавіць, забіваць, палохаць або турбаваць любых жывёл. Спартыўнае рыбалоўства можа ажыццяўляцца на падставе асобных пуцёвак лясніцтва ў парадку і ў пунктах, у пуцёўках адзначаных. Збор у заказніку любых асобнікаў для навуковых, навучальных і калекцыянерскіх мэт не дапускаецца. У асаблівых выпадках Навукова-даследчы інстытут дзяржаўных лясоў у Варшаве, як выключэнне, будзе даваць дазвол на збор узораў тым, хто вядзе навуковую працу ў заказніку.

9. Для фота- і кіназдымак у заказніку, калі гэтыя фотаздымкі не носяць аматарскага характару, патрабуецца дазвол Упраўлення дзяржаўных лясоў у Белавежы.

10. Забараняецца весці рознічны, пастаянны або пераносны гандаль на тэрыторыі заказніка без дазволу дзяржаўнай лясной інспекцыі і па-за месцамі, вызначанымі лясной інспекцыяй.

11. Наведвальнікі заказніка абавязаны выконваць ўказанні супрацоўнікаў дзяржаўнай лясной інспекцыі.

Такім чынам, прывезеныя правілы адлюстроўваюць стаўленне ўладаў да значнага прыроднага турыстычнага рэсурсу (актуальныя для 1935 г.), акрэсліваюць асаблівасці развіцця айчыннай турыстычнай індустрыі, яе рэкрэацыйнай галіны ў мінулыя эпохі. Гістарычны досвед можа быць актуальным для сучаснай індустрыі.

1. W Nowogródzkiej Stronie : biuletyn turystyczno-informacyjny. – 1935. – № 7 (9). – 8 s.